*УДК 372.881.1*

# РАЗВІЦЦЁ ПАЗНАВАЛЬНАЙ АКТЫЎНАСЦІ ВУЧНЯЎ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ЭФЕКТЫЎНЫХ АРФАГРАФІЧНЫХ ЗАДАННЯЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»

**І. М. Дзядкоўская**

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа №13 г. Мазыра»,*
*б-р Юнацтва, 47, 247760, г. Мазыр, Беларусь, irinaded4883@gmail.com*

У артыкуле прааналізавана эфектыўнасць выкарыстання заданняў па арфаграфіі ў працэсе навучання беларускай мове. Арфаграфія мае выключнае значэнне ў школьным навучанні, паколькі валоданне арфаграфічнымі нормамі, выпрацоўка ўменняў правільна пісаць неабходна кожнаму вучню, кім бы ён ні стаў у будучым. Вось чаму, зыходзячы найперш з грамадскай, сацыяльнай ролі арфаграфічных нормаў, настаўнік павінен даводзіць вучням неабходнасць авалодвання імі, бо рознага тыпу няправільныя напісанні перашкаджаюць моўным зносінам людзей. Пры выкладанні арфаграфіі кіруюся прынцыпамі сістэматычнасці, паслядоўнасці, сувязі тэорыі з практыкай, нагляднасці, пераемнасці і перспектыўнасці, індывідуальнага падыходу да вучняў, навуковасці.

***Ключавыя словы:*** беларуская мова; арфаграфія; арфаграфічныя заданні; пазнавальная актыўнасць; арфаграфічныя ўменні і навыкі.

# DEVELOPMENT OF STUDENTS 'COGNITIVE ACTIVITY THROUGH THE USE OF EFFECTIVE SPELLING TASKS WHILE STUDYING THE SUBJECT «BELARUSIAN LANGUAGE»

**I. M. Dzyadkoskaya**

*Dzyarzhaunaya ўstanova adukatsy «Syardnyaya school No. 13 in Mazyr»*
*Yunatstva Blvd., 47, 247760, Mazyr, Republic of Belarus, irinaded4883@gmail.com*

The article analyzes the effectiveness of the use of spelling tasks in the process of learning the belarusian language. Spelling is extremely important in school, because the possession of spelling rules, the development of skills to write correctly is necessary for every student, whoever he becomes in the future. That is why, based primarily on the social role of spelling rules, the teacher must prove to students the need to master them, because different types of misspellings interfere with people's language communication. When teaching spelling, I am guided by the principles of systematicity, consistency, connection of theory with practice, clarity, continuity and perspective, individual approach to students, scientific.

***Key words:*** belarusian language; spelling; spelling tasks; cognitive activity; spelling skills.

У канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская мова» адным з прынцыпаў навучання акрэсліваецца матывацыйны прынцып, накіраваны на фарміраванне ў вучняў трывалых навыкаў літаратурнага вымаўлення і правапісу; забяспечанне развіцця лагічнага мыслення, выпрацоўку спосабаў навучальнай дзейнасці, неабходных для асэнсавання законаў беларускай мовы, выяўлення значэння, формы выражэння і функцый моўных адзінак; выкарыстанне беларускай мовы ва ўсіх сферах жыццядзейнасці: пазнавальнай, навучальнай, вытворчай,

нацыянальна-культурнай, побытавай [1]. Арфаграфічная пісьменнасць з'яўляецца адным з паказчыкаў маўленчай і агульнай культуры чалавека. Для таго каб авалодаць арфаграфіяй, неабходны добра развіты маўленчы слых, веданне граматыкі, актыўнае валоданне дастатковым запасам лексікі, развітыя памяць, мысленне. Менавіта таму ў сваёй практыцы вялікую ўвагу надаю развіццю пазнавальнай актыўнасці вучняў як сродку фарміравання арфаграфічнай пісьменнасці.

Над праблемай пазнавальнай актыўнасці вучняў у розныя перыяды развіцця педагогікі працавалі многія вучоныя і даследчыкі. Г. І. Шчукіна лічыць, што пазнавальная актыўнасць – «гэта пэўная накіраванасць асобы, звернутая да вобласці пазнання, да яе прадметнага боку і да самога працэсу авалодання ведамі» [2, с. 11]. На думку Г. І. Шчукінай, фарміраванню пазнавальнай актыўнасці спрыяюць такія групы ўмоў, як змест навучання, працэс пазнавальнай дзейнасці вучняў і адносіны, якія складваюцца ў адукацыйным працэсе паміж яго ўдзельнікамі. Даследчык І. Ч. Босы адзначае, што «пазнавальная актыўнасць вучня выражаецца ў імкненні вучыцца, пераадольваючы цяжкасці на шляху здабывання ведаў, у прыкладанні максімуму асабістых валявых намаганняў і энергіі ў разумовай працы» [3, с. 3–7]. І. І. Падласы адзначае, што «пазнавальная актыўнасць вучня выражаецца ў імкненні вучыцца, пераадольваючы цяжкасці на шляху набыцця ведаў, у прыкладанні максімуму уласных валявых намаганняў і энергіі ў разумовай працы» [4, с. 95]. Такім чынам, развіццё пазнавальнай актыўнасці – гэта працэс, пры якім ствараюцца ўмовы, неабходныя для пазнавальнай актыўнасці вучняў, а вучань праяўляе гэтую пазнавальную актыўнасць.

Важным рэсурсам навучання беларускай мове з’яўляецца развіццё пазнавальнай актыўнасці як сродку павышэння арфаграфічнай граматнасці вучняў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Для развіцця арфаграфічнай граматнасці выкарыстоўваю разнастайныя віды практыкаванняў: узнаўленне правіла па дадзенай схеме; праца з арфаграфічным слоўнікам; пераклад слоў, сказаў, тэкстаў; напісанне слоў па памяці і падкрэсліванне арфаграм; тэматычныя, трэніровачныя тэставыя заданні; стварэнне ўласных тэставых заданняў; арфаграфічныя дыктанты.

У 5 класе на вучэбных занятках арганізую калектыўную дзейнасць. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы ***«Вымаўленне і правапіс галосных о, э, а»*** на этапе праверкі дамашняга задання праводжу слоўнікавую работу (пісьмо з прагаворваннем). Вучні прагаворваюць гукі, тлумачаць напісанне слоў і запісваюць словы: *г..рбарый, с..кунда, з..фір, п..рсцёнак, л..сны, верац..но, л..снічоўка, по..с, пам..ць.* На этапе праверкі разумення вучнямі новага вучэбнага матэрыялу прапаную

выбарачны дыктант: выпісаць толькі словы з літарамі *о, э* і графічна вызначыць арфаграмы. На этапе замацавання новага вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваю наступнае заданне: змяніць словы або падабраць аднакаранёвыя так, каб галосныя *о, э* сталі не пад націскам (*клопат, звон, шэрсць, дождж, колер, шэпт, чорны, полымя, сэрца, розум, шоўк*). Выкарыстоўваю прыём «Карэктар». На этапе падвядзення вынікаў урока вучні выконваюць тэставую работу ***«Правапіс слоў з літарамі о, э, а»***. На этапе інфарміравання аб дамашнім заданні прапаную заданні на выбар: падабраць 5 загадак (прыказак, прымавак) з літарамі *о, э, а,* вызначыць арфаграмы; скласці 5 тэставых заданняў па тэме ўрока; падабраць 4 рады слоў да задання «Знайдзі лішняе слова».

У 6 класе для павышэння арфаграфічнай граматнасці вучняў выкарыстоўваю індывідуальныя заданні-карткі па ўсіх тэмах арфаграфіі, рознаўзроўневыя арфаграфічныя заданні, тэставыя заданні, творчыя заданні, комплексную работу з тэкстам, складанне словазлучэнняў і сказаў, пераклад слоў, словазлучэнняў, тэкстаў, маналагічныя адказы па тэарэтычнаму матэрыялу з выкарыстаннем апорных схем; праводжу слоўнікавыя дыктанты. Пры вывучэнні тэмы ***«Правапіс -н-, -нн- у прыметніках»*** на этапе праверкі дамашняга задання паўтараем тэму «Правапіс у і ў» (табл. 1).

Табліца 1

**Бліц-тэст *«Правапіс у і ў»***

| A1. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *ў*: | A2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару *у*: |
|---|---|
| 1) та..сценны; | 1) мо..ны; |
| 2) ва ..ніверсітэце; | 2) пайшоў .. кіно; |
| 3) гучнае “..ра”; | 3) ра..нінны; |
| 4) гармонік ..зяў у рукі; | 4) накры..ка; |
| 5) дра..ляны. | 5) каля ..рны. |

На этапе падрыхтоўкі да актыўнага засваення вучэбнага матэрыялу для павышэння матывацыі вучняў арганізую работу па паўтарэнні вядомых тэрмінаў (суфіксальны спосаб утварэння прыметнікаў, утваральная аснова, словаўтваральныя суфіксы, формаўтваральныя суфіксы, суфіксы са значэннем ацэнкі) і прапаную ў папярэднім заданні (бліц-тэст) вызначыць прыметнікі, паспрабаваць растлумачыць іх правапіс (праблемнае пытанне) і вызначыць тэму ўрока. На этапе засваення новых ведаў арганізую калектыўную працу з тэарэтычным матэрыялам падручніка і падрабязным аналізам прыкладаў. На этапе замацавання новага вучэбнага матэрыялу спачатку выконваем практыкаванне (запісаць словы, вызначыць утваральную аснову, зрабіць выснову пра напісанне *-н-/-нн-* у залежнасці ад утваральнай асновы: *калядны, вячэрні, зорны, санны, песенны, шкляны, дзённы, цагляны,*

*шырачэнны, даўжэнны, палымяны, вогненны, іменны*), потым пішам размеркавальны дыктант. Формы праверкі заданняў кожны раз вар'ірую: вусныя адказы, пісьмовая работа на дошцы і калектыўная праверка, самаправерка, узаемаправерка, каменціраванае пісьмо. На этапе падвядзення вынікаў урока выкарыстоўваю прыём «Пільнае вока». На этапе інфарміравання аб дамашнім заданні прапаную заданні на выбар: запісаць прыметнікі, устаўляючы прапушчаныя літары, графічна растлумачыць правапіс *-н-/-нн-*; скласці 5 тэставых заданняў па тэме ўрока; напісаць міні-сачыненне «Зімой у лесе» з выкарыстаннем 6–10 прыметнікаў з *-н-/-нн-*.

У 7 класе пры вывучэнні тэмы ***«Правапіс прыслоўяў праз дэфіс»*** на этапе праверкі дамашняга задання паўтараем тэму ***«Правапіс падоўжаных зычных»*** (заданне «Падбяры сваякоў»), у працэсе выканання якога вучні падбіраюць па пяць слоў з аналагічным напісаннем (да слоў *насенне.., суддзя.., Ульяна.., лью.., група.., ванна…*). Напісанне кожнага слова абавязкова суправаджаецца графічным абазначэннем арфаграм і тлумачэннем правапісу (тэарэтычны матэрыял) па апорным канспекце. На этапе падрыхтоўкі да актыўнага засваення новага вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваю тэкст «Лясное возера» (заданне: вызначце стыль і тып тэксту, знайсці прыслоўі, паспрабаваць растлумачыць іх правапіс). Такім чынам разам вызначаем тэму і задачы ўрока. На этапе засваення новых ведаў арганізую калектыўную работу з тэарэтычным матэрыялам апорнага канспекта, аналізуем прыклады, тлумачым правапіс прыслоўяў, якія знайшлі ў вышэйназваным тэксце. На этапе замацавання новага вучэбнага матэрыялу калектыўна выконваем вуснае практыкаванне, тлумачым правапіс прыслоўяў (абы-як, куды-небудзь, далёка-далёка, раз-пораз, крыж-накрыж, сюды-туды, па-новаму, па-сяброўску, па-сабачы, па-другое, на-бацькоўску, шыта-крыта, дэ-факта), пішам выбарачны слоўнікавы дыктант і яшчэ раз звяртаемся да тэарэтычнага матэрыялу з мэтай карэкцыі ведаў. Прапаную выканаць заданне па варыянтах, індывідуальныя заданні па картках (табл. 2).

Табліца 2

**Заданне па варыянтах**

| ***Варыянт 1*** | ***Варыянт 2*** |
|---|---|
| Заданне: выпісаць толькі прыслоўі, якія пішуцца праз дэфіс | |
| *Ледзь ледзь, дзе нідзе, па ранейшаму, па жнівеньску, не як, што дзень, за летась, на памяць, раз пораз, у трох, сям там, як небудзь, які сьці, ціха ціха, па першае, у першыню, калі нікалі, па роўну, не дзе* | *Па святочнаму, што год, па майстэрску, па абапал, перш наперш, абы дзе, па веснавому, след у след, па ціху, па троху, раз у раз, мала па малу, пакуль што, абы дзе, па воўчы, тэт а тэт, па мойму, ні як* |

На этапе падвядзення вынікаў урока выкарыстоўваю прыём «Ліст з белымі плямамі» (дапісаць па 3 прыслоўі да кожнага рада). На этапе інфарміравання аб дамашнім заданні прапаную заданні на выбар: запісаць сказы, раскрываючы дужкі, і графічна растлумачыць правапіс прыслоўяў; скласці слоўнікавы дыктант па тэме ўрока; скласці 8 тэставых заданняў; заданне на паўтарэнне правапісу арфаграм (паўтарыць тэму ***«Правапіс галосных у складаных словах»***).

Пабудаваная такім чынам работа садзейнічае ўсвядомленаму і канкрэтнаму ўспрыманню вучэбнага матэрыялу, павышэнню арфаграфічнай граматнасці вучняў і пераходу да сістэматычнай самастойнай работы ў 8–9 класах.

У 8 классе пры вывучэнні тэмы ***«Сказы з аднароднымі членамі»*** на этапе праверкі дамашняга задання паўтараем тэму ***«Правапіс мяккага знака»*** шляхам выканання тэставага задання (вучні каменціруюць адказы, карыстаючыся пры неабходнасці тэарэтычным матэрыялам апорнага канспекта, дадаткова падбіраюць яшчэ прыклады на напісанне мяккага знака). На этапе падрыхтоўкі да актыўнага засваення новага вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваю тэкст «Зіма ў лесе» (заданне: прачытаць тэкст, скласці слоўнікавы дыктант (15 слоў) на правапіс *е, ё, я,* правапіс глухіх зычных, правапіс *не (ня)* са словамі розных часцін мовы; графічна растлумачыць правапіс слоў). Вучні зачытваюць сказы з аднароднымі членамі (апора на раней набытыя веды пра аднародныя члены сказа). Праводжу гутарку па пытаннях: Якія члены сказа называюцца аднароднымі? Якімі часцінамі мовы з’яўляюцца аднародныя члены ў сказах тэкста? Як спалучаюцца паміж сабой аднародныя члены ў сказах? На этапе замацавання новага вучэбнага матэрыялу прапаную выканаць рознаўзроўневыя заданні. Праверка выканання ўсіх практыкаванняў абавязкова суправаджаецца тлумачэннем напісанняў слоў (арфаграфічная работа) і тлумачэннем умоў пастаноўкі знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа. Тэарэтычныя звесткі падаюцца ў выглядзе лінгвістычных паведамленняў, дыскусій, праблемных пытанняў.

Падчас арганізацыі адукацыйнага працэсу варта памятаць пра тое, што самае небяспечнае пры навучанні – гэта фармальныя веды. Атрыманыя без цікавасці, без станоўчых адносін да вывучанага матэрыялу, яны з’яўляюцца непатрэбным баластам, бо не будуць актыўна прымяняцца на практыцы, не будуць выклікаць жадання працаваць з захапленнем. Для вучняў любога ўзросту матывацыяй навучання з’ўляецца займальнасць падачы тэарэтычнага і практычнага матэрыялу. Рэалізаваць пастаўленыя мэты і задачы дапамогуць разнастайныя рубрыкі, якія арыентуюць як на ўзнаўленне тэарэтычнага

матэрыялу, так і на замацаванне ўменняў і навыкаў. Напрыклад, рубрыка «Стол даведак» (з тлумачальнага слоўніка падбярыце і запішыце тры мнагазначныя словы з тлумачэннем іх значэнняў; запішыце з імі сказы). Рубрыка «Папрацуем перакладчыкамі» (перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову, адзначце асаблівасці сінтаксічнай сувязі слоў у беларускай мове ў параўнанні з рускай: пойти за малиной, бродить по улицам, посмеяться над своими неудачами, два высоких дерева, извините меня за опоздание). Пазбавіцца фармальнага засваення ведаў таксама дазваляе выкарыстанне вершаваных тэкстаў, прыказак, прымавак, загадак, гумарэсак. Матывацыі навучання садзейнічае калектыўнае складанне алгарытмаў, праца са схемамі, табліцамі, ілюстрацыя моўных з'яў уласнымі малюнкамі, складанне лінгвістычных казак, займальных апавяданняў, рашэнне лінгвістычных задач.

Паслядоўна праведзеная арфаграфічная работа садзейнічае развіццю трывалых навыкаў літаратурнага вымаўлення і правапісу, выпрацоўцы спосабаў навучальнай дзейнасці і падрыхтоўцы вучняў да самастойнага стварэння сістэмы заданняў па арфаграфіі і пабудове лагічных ланцужкоў разважанняў у 9 класе. Самастойная дзейнасць вучняў па складанні заданняў садзейнічае развіццю арфаграфічнай граматнасці, неабходнай для асэнсавання законаў беларускай мовы, выяўлення значэння, формы выражэння і функцый моўных адзінак; развіццю рэфлексіўных, ацэначных уменняў і навыкаў.

Сістэматычнае выкарыстанне заданняў па арфаграфіі садзейнічае аптымізацыі працэсу навучання за кошт змены відаў дзейнасці, актыўнаму ўдзелу вучняў у пазнаваўчым працэсе, скіроўвае іх да творчасці, дазваляе вызначыць індывідуальны адукацыйны маршрут з улікам здольнасцей і інтарэсаў.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Канцэпцыя вучэбнага предмета «Беларуская мова» // Адукацыйны партал [Электронны рэсурс]. URL: www.adu.by / (дата звяртання: 20.04.2021).

2. *Щукина Г. И.* Педагогические проблемы формирования познавательных интересов учащихся. М. : Педагогика. 1998.

3. *Босы І. Ч.* Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці праз дыферэнцыяцыю навучання // Беларуская мова і літаратура. 2007. № 4. С. 3–7.

4. *Подласый И. П.* Педагогика. Новый курс: Учебник для студ. пед. вузов: В 2 кн. М. : Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 1999. Кн. 1: Общие основы.